# АФГАН: СМУТАК І БОЛЬ

15 лютага спаўняецца 10 гадоў з дня вываду абмежаванага кантынгенту савецкіх войск з Афганістана. Так сталася, што напярэдадні гэтай даты мы сустрэліся з Міхаілам Фёдаравічам Кабёлкам, які жыве і працуе ў калгасе «Кастрычнік». Восенню 1987 года пасля заканчэння падрыхтоўкі ў вучэбным цэнтры ў Літве ён трапіў у Афганістан. Служыць давялося ў вядомай Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. А да гэтага было звычайнае жыццё, як і ў многіх юнакоў. Нарадзіўся Міхаіл Кабёлка ў вёсцы Махіроўка, дзе жылі яго бацькі. Закончыўшы Кублішчынскую васьмігодку, вучобу працягваў у Міёрскай СШ № 3. Пасля паступіў у Віцебскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 154.

– Гэта вучылішча, – расказвае Міхаіл, – рыхтавала кадры для тэлезазода «Віцязь». Я абраў спецыяльнасць токара.

... Ці думаў юнак, што яму, чалавеку, які нарадзіўся ў пасляваенны час, давядзецца самому прыняць удзел у крывавай бойні?

– Канешне, – адзначае Міхаіл, – такое цяжка было нават уявіць.

Тым не менш маладыя байцы апынуліся на самай сапраўднай вайне. Праўда, яшчэ ў абласным ваенкамаце іх папярэдзілі, што многія будуць служыць у Афганістане. Нават перасцераглі. Маўляў, калі хто не жадае, то можа адмовіцца. Такіх не было. «Расшчапленне душы» адбывалася на ваеннай службе. Цяпер чпста можна пачуць ад розных людзей: «Мы памыляліся, нас падманвалі, але была вера, а ў што верыце вы, маладыя?» Сапраўды, у што верыць сённяшняму маладому пакаленню? Над гэтым пытаннем паразважалі з Міхаілам Фёдаравічам.

– Ведаеце, у Афгане не вельмі задумваўся над гэтай праблемай. Я быў ваенным чалавекам, які павінен выконваць загад камандзіра. Асэнсаванне таго, што мы робім нешта не тое, прыходзіла пазней і паступова. Даводзілася размаўляць з простымі афганцамі. Яны гаварылі, што ідзіце дамоў, мы самі вырашым свае праблемы. Афіцыйная прапаганда тлумачыла сітуацыю інакш. Мы аказваем дапамогу брацкаму афганскаму народу ў пабудове дэмакратычнай дзяржавы.

Тым не менш была вера ў правільнасці крокаў кіраўніцтва. Прасвятленне прыходзіла марудна. На заканчэнне службы ўсё часцейшымі станавіліся размовы ў асяроддзі салдат, што ўвод войск – чысцейшая авантура. Да такой высновы падвялі балючыя ўражанні вайны.

М. Ф. Кабёлка служыў на заставе № 32. Яна размяшчалася за некалькі кіламетраў ад Кабула – сталіцы Афганістана. Асноўная задача байцоў – ахова штаба 40-ой арміі. Байцы ўдзельнічалі ў засадах, рабілі імклівыя маршы. Салдацкае шчасце для Міхаіла ў

тым, што за ўвесь час знаходжання на вайне яго ні разу не параніла, не кантузіла. Ён быў апературам-наводчыкам на бронетранспарцёры. Узнагароджаны некалькімі медалямі. Цікава, што летась яму быў уручаны медаль «За адвагу». Узнагарода знайшла былога воіна амаль праз 10 гадоў. Пацікавіўся ў Міхаіла тым, за што, па яго меркаванню, узнагародзілі яго. Трэба сказаць, што сярод салдат гэтая ўзнагарода мае вагу. За проста так яе не давалі. Тлумачэнне Міхаіла атрымалася занадта будзённым. На здным з перавалаў зрабілі засаду, пастралялі ў «духаў», як называлі салдат праціўніка. Вось і ўсё. Былы афганец, відаць, не захацеў паглыбляцца ў даўнюю гісторыю, вярэдзіць свае ўспаміны.

Перад вывадам войск з Афганістана ў многіх месцах рабіліся блок-пасты. Асноўная іх задача – не дапусціць раптоўнага нападу праціўніка на рухаючыеся калоны. Вывад войск у такіх блок-пастах забяспечваў і Міхаіл Фёдаравіч Кабёлка.

4 мая 1989 года Міхаіл быў звольнены ў запас. Цяпер жыве ў роднай Махіроўцы ў бацькоўскім доме. Жанаты. У сям'і расце дачушка. Былы салдат, здаецца, задаволены жыццём, бо ёсць праца, сям'я. Аднак яго хвалюе жыллёвая праблема. Пакуль пажыць можна і ў бацькі, а як далей?

Што да работы, то яе хапае.

– Для токара ў майстэрні заўсёды ёсць справа, – зазначае Міхаіл. – Тэхніка зношаная, ламаецца, механізатары выконваюць большасць рамонтных работ самі. Вось і дапамагаю ім.

Пагаварылі пра вясковае жыццё. Міхаіл задаволены, што старшыня калгаса чуйна ставіцца да просьб вяскоўцаў. Калі трэба, то можна ўзяць тэхніку для апрацоўкі агарода, прывезці дроў.

А калі здарыцца вольная хвіліна, то Міхаіл любіць палавіць рыбу. Праўда, як ён сам прызнаўся, да зімовай рыбалкі ў яго душа не ляжыць, іншая справа летам.

Яшчэ былы воін адзначыў, што ў вёсцы становіцца менш моладзі. Гэта трывожны сімптом.

Гаварыў ён, што калі-нікалі сустракаеіцца з баявымі сябрамі. На Міёршчыне пражываюць былыя афганцы.

А начамі часта сніцца Афган. Не забываецца тая пара, калі грымелі баі, побач гінулі таварышы.

– З памяці не выкрасліць былое, – гаворыць афганец. – Яно назаўсёды ў маім сэрцы.

Сёння ж М. Ф. Кабёлка стварае сваю гісторыю мірнага жыцця.

***Л. Касаты***

*Сцяг працы (Міёры). — 1999. — 13 лют. — С. 2.*